А.А. Анікевіч

# “Кароткі нарыс гісторыі Навагрудскай спецшколы-інтэрната”



Навагрудак,
2020 г.

# Глава 1. На шляху станаўлення

Вы чулі, як вясной пяюць птушкі? А як падаюць кроплі дажджу на лістоту клёнаў? А вы чулі… Колькі гэтых "А"… Для кожнага з нас – тых, хто прывык да звычайных рэчаў, – пытанні наіўныя і нейкія надуманыя. А для дзяцей, што ад нараджэння глуханямыя ці набылі гэты статус на працягу жыцця, як ім?

Вайна пакацілася на Захад, пакінуўшы разбураныя гарады і вёскі, пакінуўшы гора і скруху, але дала надзею на мірнае жыццё тысячам, мільёнам людзей.

Год 1944. Аперацыя "Баграціён" падышла да свайго лагічнага завяршэння. Землі Беларусі назаўсёды вызвалены ад карычневай чумы. Людзі будавалі зямлянкі, баракі, недзе было патрэбна жыць, зімаваць, каб агледзеўшыся, няспешна будаваць свае гнёзды. У гэтым хаосе першага верасня ў БССР пачынаецца новы навучальны год. На тэрыторыі Навагрудскага раёна расчынілі дзверы 2 сярэднія, 7 сямігадовых і 55 пачатковых школ. Селі за парты 6284 вучні ў прыстасаваных будынках, часам пры поўнай адсутнасці школьнай мэблі, але з вялікім жаданнем вучыцца. Гэтую дывізію школьнікаў раёна навучалі ў тым далёкім годзе 193 настаўнікі, 61 з іх працаваў у горадзе, астатнія ў сельскіх школах. У кастрычніку 1944 года СНК БССР прыняў Пастанову "Аб арганізацыі дзіцячых дамоў для глуханямых дзяцей". А 14 снежня 1944 года з'явілася рашэнне выканаўчага камітэта Баранавіцкага абласнога савета дэпутатаў працоўных № 205 "Об организации и открытии школы слуха и речи в Барановичской области".

"Исполком облсовета депутатов трудящихся решил:

1. Открыть школу для глухонемых с охватом 100 человек в г.Новогрудке.

2. Обязать облторготдел бесперебойно снабжать продуктами питания согласно существующих норм для детдомовцев.

3. Обязать ОБЛФо финансировать школу слуха и речи в г.Новогрудке.

4. Обязать заведующего ОБЛОНО т. ЛіОРО до 01.01.1945 г. укомплектовать школу кадрами.

5. Обязать председателя Новогрудского райисполкома предоставить соответствующее помещение под республиканскую школу глухонемых".

У снежні 1944 года школа глуханямых размяшчалася па вул. Свярдлова, д. 15 А. Аднак гэты будынак быў выключна не прыстасаваны для такога размяшчэнняі з 20.11.1945 года па рашэнні Выканкама гарадскога Савета Дэпутатаў працоўных ад 07 мая 1945 года школе глуханямых дзяцей быў прадастаўлены дом па вуліцы Камсамольскай, д. 11 і будынак па вуліцы Камсамольскай, д.18, які займаў "ОРС", пад сталовую для арганізацыі харчаблока для школы глуханямых. Будынак быў двухпавярховы. На першым паверсе размяшчаўся інтэрнат для дзяўчынак на 2 пакоі па 20 дзяцей у кожным. Два пакоі, па 18 чалавек пражывання ў кожным, былі адведзены пад інтэрнат для хлопчыкаў Адзін пакой быў заняты пад канцылярыю школы. На другім паверсе 5 пакояў былі адведзены пад вучэбныя класы. Чатыры другія пакоі будынка па вуліцы Камсамольская былі прыстасаваны для размяшчэння кухні і сталовай (2 пакоі), а яшчэ кладоўкі і аднаго класа. З-за недахопу памяшканняў у школе адсутнічаў ізалятар, чырвоны куток, пральня, лазня і вучэбна-вытворчыя майстэрні. Будынкі ацяпляліся печкамі.

Вучні пачалі паступаць у школу з сакавіка 1945 года (5 чалавек). У чэрвені навучалася 10 дзяцей, у жніўні 1945 года – 20 школьнікаў, у верасні – 34, у лістападзе 1945 г. – 41 вучань. У школе працавалі 4 класы і адзін "Падрыхтоўчы" для дашкольнікаў. Узроставы склад вучняў: ад 7 да 14 гадоў – 37, звыш 14 гадоў – 4. У школе ў гэты час працавала 6 педагагічных работнікаў:

Сурыновіч А.В. – дырэктар школы. Адукацыя сярэдняя спецыяльная, педагагічны стаж – 7 гадоў.

Грыневіч А.С.– завуч. Сярэдняя спецыяльная адукацыя, педагагічны стаж – 18 гадоў.

Сцепанцова А.В. – настаўнік. Сярэдняя спецыяльная адукацыя, педагагічны стаж – 7 гадоў.

Куленковіч В.А. –настаўнік. Сярэдняя спецыяльная адукацыя, педагагічны стаж – 5 гадоў.

Панкевіч Н.С. – настаўнік. Сярэдняя спецыяльная адукацыя, педагагічны стаж – 7 гадоў.

Лазарэвіч З.В. – выхавальнік. ярэдняя спецыяльная адукацыя, педагагічны стаж – 10 гадоў.



Будынак по адрасе: вул.Свярдлова, д.15 А.

Для аб’ектыўнасці мы павінны заўважыць, што першым дырэктарам школы зусім непрацяглы час, паўгода, працаваў Шулевіч Генадзій Барысавіч.

Сярод іншых работнікаў ці, дакладней, абслугоўваючага персаналу працавалі: загадчык гаспадаркі, загадчык падсобнай гаспадаркі на 0,5 стаўкі, бухгалтар, дворнік-вартаўнік.

Школа мела ўласную падсобную гаспадарку: 2,5 га ворнай зямлі, двух коней, дзве цялушкі.

У 1945 годзе было пасеяна: аўса – 1 га, ячменю– 0,6 га, бульбы – 0,7 га, гародніны – 0,2 га. У краіне, якая толькі вызвалілася ад фашысцкіх акупантаў, меўся цэлы шэраг праблемных пытанняў. Навагрудская школа для глуханямых не была выключэннем. Установа мела вялікую патрэбу ў мэблі. У распараджэнні выхаванцаў і настаўнікаў школы было толькі 3 шафы для адзення. Адсутнічалі люстэркі, якія былі неабходны для работы настаўнікаў-лагапедаў, адсутнічалі музычныя інструменты, дыдактычны матэрыял, канцылярскія тавары.

У наяўнасці было 30 драўляных самаробных лыжкаў. Патрабавалася яшчэ 11. Не хапала пасцельнай бялізны. На 01.09.1945 г. было ў наяўнасці 15 камплектаў і 40 ручнікоў. У сталовай не хапала 2-х сталоў і 4-х лавак. Харчаблок быў укамлектаваны сталовым посудам. Многія вучні не мелі абутку, верхняй цёплай вопраткі, але ў іх было жаданне вучыцца, жаданне працаваць, жаданне дапамагаць. У педагогаў быў аптымізм і бязмежная вера ў сілу чалавека і калектыву, мудрасць савецкага кіраўніцтва.

У чарговы раз школа змяніла месца знаходжання ў 1947 годзе – пераехала ў будынак па вуліцы Леніна, д. 59.

1947-1948 навучальны год у Навагрудскай школе глуханямых закончыла 85 вучняў, з іх 78 – былі пераведзены ў наступныя класы, 5 – пакінуты на паўторны курс, 2 вучні навучаліся па індывідуальнай праграме для разумова-адсталых. Са школы, па завяршэнні навучання, было выпушчана 12 выпускнікоў, 5 з іх прадоўжылі навучанне ў Кобрынскай школе слыху і мовы, а астатнія 7 – былі працаўладкаваны ў швейныя і абутковыя майстэрні г.Мінска і г.Баранавічы.

Сямейнае становішча вучняў школы для глуханямых дзяцей у 1947-1948 навучальным годзе выглядала наступным чынам:

Круглыя дзеці-сіроты, – 20 чал.;

Дзеці, які мелі толькі маці, – 40 чал.;

Дзеці, які мелі толькі бацьку, – 6 чал.;

Дзеці, што выхоўваліся ў няпоўных сем’ях, – 19 чал.

Педагагічныя сілы школы налічвалі 11 “штыкоў”. Працавалі 11 рабочых і 18 служачых. Сярод іх:

Кацалапаў В.А. – дырэктар;

Ціліпа О.В. – завуч;

Сцепанцова Г.В. – настаўнік падрыхтоўчага класа;

Панкевіч Н.С.– настаўнік падрыхтоўчага класа;

Файбіч Н.В. – настаўнік 1-га класа;

Дзедавец В.Г. – настаўнік 2-га класа;

Вікенцьева Р.Т. – настаўнік 3-га класа;

Кулінковіч В.А. – настаўнік 4-га класа;

Мальцава А.І. – настаўнік 7-га класа;

Лазарэвіч З.В. – выхавальнік 1-га класа;

Ганчароў І.С. – мастак.

Усе педагагічныя работнікі, за выключэннем завуча, у якога была вышэйшая адукацыя, мелі адукацыю сярэднюю спецыяльную.

Уяўленні аб тым, як харчаваліся выхаванцы школы дае справаздача аб нарыхтоўцы сельска-гаспадарчай прадукцыі на 1947-1948 навучальны год. Было нарыхтавана:

бульбы – 25 т.;

капусты – 5 т.;

гуркоў – 2 т.;

чырвоных буракоў – 1,5 т;

цыбулі – 0,5 т.;

морквы – 1 т.

І гэта на 85 выхаванцаў!!! Адметнасцю было і тое, што, згодна гадавой справаздачы, у ежу выхаванцаў ужываліся грыбы. Справаздача па арганізацыі харчавання за 1947 год дае магчымасць убачыць, як было арганізавана харчаванне. Усяго на арганізацыю харчавання выхаванцаў было затрачана 244.000 тыс. руб., з іх на закупку мяса – 45.080 руб., рыбы – 0 руб., тлушчу – 31.700 руб., круп – 10.700 руб., цукру – 20.700 руб., шакаладу (павідла) – 0 руб., малака – 18.330 руб., смятаны – 3.000 руб., тварагу – 0 руб., яйкаў – 4.600 руб., хлеба – 42.900 руб., мукі пшанічнай – 1.900 руб., пячэння – 100 руб. Як бачна – не шыкавалі, але і не галадалі.

Для ацяплення школы ў зімовы час было нарыхтавана і вывезена сіламі работнікаў школы і старэйшых вучняў 400 м$^3$ дроў.

У школе мелася тэлефонная лінія і тэлефонны апарат. Тэлефонны нумар школы быў 128. Мовай навучання была руская.

<u>Як камплектавалася школа?</u>

Цікавым будзе зазірнуць у гадавую справаздачу за 1949 год. Вось як выглядае рух вучняў за гэты год: прыбыло з 01.01.1948г. па 01.01.1949 г. 26 вучняў, з іх:

З прыёмнікаў, размеркавальнікаў МУС – 2;

ад мясцовага насельніцтва праз аддзелы народнай адукацыі – 21;

з іншых дзіцячых дамоў – 3.

У 1948 годзе ў школе ўжо працавала 13 выхавальнікаў. Дарэчы, месячны заробак выхавальніка складаў 657 руб., дырэктар і завуч атрымлівалі па 790 руб., загадчык гаспадаркі – 360 руб. Менш за ўсіх атрымлівалі прачка, памочнік кухара, рабочая кухні, прыбіральшчыца – па 235 руб., а ўжо конюх-возчык атрымліваў 310 руб.

Школьная падсобная гаспадарка дазваляла паляпшаць рацыён выхаванцаў, павялічваць яго, але згодна “Палажэння аб падсобнай гаспадарцы пры Навагрудскай школе глуханямых” зацверджанага загадчыкам Баранавіцкім АБЛАНА т. ЛіОРО ад 23.06.1957 г. п.5 “Администрация школы обязана привлекать к работе взрослых детей, установив для них режим рабочего дня, как посильный труд”.

Але не толькі хлебам і навукай жыла ўстанова адукацыі. Шмат увагі надавалася ўмацаванню матэрыяльнай базы школы і ў першую чаргу вучэбных майстэрняў, што давала магчымасць выпускнікам атрымліваць рабочую спецыяльнасць і без дадатковай вучэбнай падрыхтоўкі пасля заканчэння школы ўладкавацца на працу.

Так у 1948 годзе ў школьных майстэрнях з’явіліся 3 швейныя машыны, электрарухавік – 1, сталярныя сталы – 3.

З масавай мэблі ў школе меліся:

парты школьныя – 23;
сталы – 22;
крэслы і табурэткі – 26;
ложкі жалезныя – 40;
матрацы пружынныя – 40;
шафы для адзення – 5;
канапы пружынныя – 2;
буфет – 1.

На працягу 1958-1959 навучальнага года школа-інтэрнат, нікуды не пераязджаючы, змяніла свой адрас. На верасень 1958 года яна размяшчалася па адрасе: г.Навагрудак, вул. Леніна, д. 68, а ўжо ў красавіку 1959 года – па адрасе: вул. Леніна, д.59. Змяніўся тэлефонны нумар школы, ён стаў 1-36. У штатным раскладзе школы – 32 адзінкі. Самыя вялікія расходы ў бюджэтнай смеце складалі:

заробак штатных работнікаў – 36,6 тыс. руб.;
набыццё бензіну – 2000руб.;
рамонт абутку і адзення – 5000 руб.;
Прагляд кінафільмаў (за 1 сеанс 6 руб. на 1 вучня) – 57700=38304 руб.

У школе на 01.09.1958 г. навучалася 112 вучняў. Плошча ўсіх будынкаў школы складала 1350 м$^2$. Меўся водаправод і каналізацыя. Для ацяплення выкарыстоўвалася 40 печак, для прыгатавання ежы – 2 пліты.

<u>У комплекс школы ўваходзілі наступныя будынкі:</u>

дом трохпавярховы (S=720 м$^2$);
сталовая драўляная (S= 65 м$^2$);
пральня драўляная (S=188 м$^2$);
класы і рабочыя пакоі (S=111м$^2$);
майстэрні швейныя і сталярныя (S=136 м$^3$).



Фотаздымак, 1954 год

Першы выпуск Настаўніцы Цэтлінавай Р. Е. Спшк-17



Фотаздымак, 1954 год

Вучні 5 класа з выхавацелямі Мальцавай А. І. і Аляксандровіч Г. А. Спшк-12

На ацяпляльны сезон патрабавалася 480 м$^3$ дроў. У смеце расходаў на той навучальны год былі прадугледжаны грашовыя сродкі на набыццё наступных рэчаў:

халадзільнік – 1;
швейныя машыны – 15;
крэслы – 218;
талеркі – 130;
шафы – 18;
падушкі – 115;
коўдры – 115;
шапкі вушанкі – 60.

У Савецкай Беларусі, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, у кастрычніку 1960 года была аб’яўлена піянерская двухгодка 1960-1962гг., якая ажыццяўлялася пад лозунгам “Пионерская двухлетка – наших славных дел пора”. Піянерскія дружыны кожнай сярэдняй і сямігадовай школ бралі абавязкі па паляпшэнні матэрыяльнай базы школы, аказанні шэфскай дапамогі калгасам у добраўпарадкаванні тэрыторыі ферм. Навагрудскія школы бралі на сябе ад 4 да 15 абавязкаў. Пераважалі наступныя: збор металалому, макулатуры, попелу, выраб шпакоўняў, шэфства над фермай, пасадка дрэў. Вучні Навагрудскай школы для глуханямых дзяцей узялі абавязак:

арганізаваць самаабслугоўванне;
пабудаваць будынак бібліятэкі;
усім вучням вучыцца без двоек;
пабудаваць геаграфічную пляцоўку.

На той час піянерская дружына Навагрудскай школы для глуханямых імя П. Марозава налічвала 52 піянеры і 20 акцябрат. Здаецца, зусім няшмат, але ўсе абавязкі былі выкананы.

У 1961-1962 навучальным годзе ў школе вучылася 114 вучняў. Педагагічны калектыў налічваў 27 работнікаў. У штатным раскладзе школы з’явіліся новыя пасады: загадчык слухавога кабінета, настаўнік па сталярнай справе, настаўніка па швейнай справе, настаўнік рытмікі. Са 114 вучняў на “5” паспявалі 98 чалавек, на “4” і

“5” – 16 вучняў, на “2” – 0 вучняў. Працавала 12 класаў-камплектаў. Ужо пачынаючы з канца 50-х гадоў школа займалася вытворчай працай.

Так па выніках 1961-1962 навучальнага года ў швейнай майстэрні школы было пашыта:

сукенак для дзяўчынак – 36 шт.;
сукенак жаночых – 54 шт.;
касцюмаў для хлопчыкаў – 28 шт.;
падкоўдранікаў – 30 шт.;
прасцінаў – 60 шт.;
навалачак – 40 шт.;
ручнікоў – 120 шт.;
штаноў хлапчуковых – 22 шт.;

У сталярнай майстэрні адрамантавана:

крэслаў – 180 шт.;
шафаў – 40 шт.;
тумбачак – 20 шт.;
дзвярэй – 6 шт.
школьных парт – 10шт.

Выраблена:

каробак дзвярных – 1 шт.;
каробак аконных – 1 шт.;
крэслаў дзіцячых – 12 шт.;
табурэтак – 10 шт.

На прышкольным участку S 0,15 га было вырашчана:

морквы – 702 кг;
цыбулі – 133 кг;
буракоў чырвоных – 2360 кг;
агуркоў – 40 кг;
шчаўя – 120 кг.

У пазаўрочны час дзеці школы маглі наведваць наступныя гурткі: літаратурны, арыфметычны, юннатаў, малявання, фатаграфічны.

У школе на кожнага вучня было:

бялізны пасцельнай – 4 камплекты;
абутку – па 3 пары;
верхняй вопраткі – 4 пары.

Мелася падсобная гаспадарка S = 2 га. У той жа год было вырашчана: бульбы – 19475 кг, ячменю – 539 кг, аўса – 532 кг. У школе меліся аўтамабілі ГАЗ-52, ГАЗ-51, конь, гадавалася 60 трусоў, 8 свіней і 7 авечак. Школа ў халоднае надвор’е ацяплялася печкамі. На ацяпляльны сезон кожны год нарыхтоўвалася: дроў – 180 м$^3$, торфу – 100 тон, торфабрыкету – 28 тон.

У Гродзенскай вобласці працавала 3 школы-інтэрнаты для глухіх дзяцей: Ваўкавыская, Ашмянская, Шчучынская.

У 1962-1963 навучальным годзе ў школе навучалася 90 вучняў, працавала 12 класаў-камплектаў ад “падрыхтоўчага” да 10, былі паралелі. Колькасць выпускнікоў – 10 чалавек. Паспяховасць у вучняў школы-інтэрната была не надта высокая, мяркуйце самі: на “5” закончылі навучальны год толькі 7 вучняў, тых, хто меў гадавыя “2”, – не было.

Асноўная частка вучняў мела адзнакі “3” і “4” (45 вучняў), на “4” і “5” навучалася 35 вучняў, а толькі на “3” – 12 вучняў.

Шмат увагі ў школе ўдзялалася працоўнаму навучанню і выхаванню. Традыцыяй школы быў высокі ўзровень прафарыентацыйнай і фізкультурна-масавай работы. На працягу навучальнага года выхаванцы школы наведалі: кафельныя майстэрні, мэблевую фабрыку, цагляны і вапнавы заводы, электрастанцыю, калгасныя майстэрні і фермы, Бярозаўскі шклозавод.

Нягледзячы на тое, што вайна закончылася толькі тры гады таму, вучні нядрэнна былі забяспечаны адзеннем і абуткам. Так у школе на складах мелася (на 01.02.1948г.):

штаны хлапчуковыя – 219;
сукенкі для дзяўчынак – 264;
гімнасцёркі і верхнія футболкі – 90;
паліто зімовае – 147;
абутак розны – 205 пар;
валёнкі – 31 пара.

А ўжо ў 1954-1955 гг. школа даўно абжылася на новым месцы па адрасе: вул. Савецкая, д. 59 (з 1947 г.) у трохпавярховым будынку 1920 года пабудовы, плошча якога складала 720 м$^2$. Школа мела сталовую, размешчаную ў драўляным будынку 1950 года пабудовы (S=165 м$^2$), баню – прачачную 1949 года пабудовы (S=165 м$^2$), рабочыя пакоі ў драўляным будынку 1951 г. (S=141м$^2$), швейную і сталярную майстэрні, што мясціліся ў драўляным будынку 1953 г. пабудовы (S=136 м$^2$).

А вось што ў гэтым годзе школа набыла:

магнітафон – 1;
машыны швейныя – 9;
піла цыркулярная – 1;
станок свідравальны – 1;
талеркі – 488;
накідкі на падушкі – 100;
хустачкі насавыя – 154.

Дарэчы, у гэты час ва ўстанове навучаецца 100 хлопчыкаў і дзяўчынак. Значна расшырыўся педагагічны калектыў. У школе, акрамя дырэктара і завуча, працуюць 16 настаўнікаў, 6 выхавальнікаў, доктар, медыцынская сястра, старшая піянерважатая і інструктар па працы. Па стажу работы педагагічныя работнікі размяркоўваліся наступным чынам: больш за 10 гадоў – 4 чалавекі, 5 гадоў – 8 чалавек, а астатнія мелі стаж адзін год ці з’яўляліся студэнтамі завочнага аддзялення Навагрудскага педвучылішча.

Заработная плата педагогаў складала: ад 1035 руб. (у дырэктара) да 618 руб. у месяц, у старшай піянерважатай – 270 руб. Уражвае другі факт: ні адзін з педагогаў, уключаючы дырэктара, не мелі вышэйшай адукацыі, і тое, што 6 педагогаў былі выпускнікамі Мсціслаўскага педагагічнага вучылішча і 7 – Навагрудскага педвучылішча. У летні перыяд пасля 1955-1956 навучальнага года на базе Пінскай школы-інтэрната для глуханямых дзяцей быў створаны міжшкольны піянерскі лагер на 125 дзяцей. Навагрудскай школе было выдзелена 22 месцы на працягу двух змен. Акрамя Пінска, вучні школы праходзілі аздараўленне на базе ра-

ённага піянерскага лагера, які працаваў на базе Гарадзечанскай НСШ і гарадскога піянерскага лагера на базе СШ № 2 г.Навагрудка.

Кожны год меў свае адметнасці, нешта новае прыносіў у жыццё школы. Не стаў выключэннем і 1957-1958 навучальны год. 10.10.1957г. было зацверджана "Палажэнне аб вытворчых майстэрнях пры агульнаадукацыйных школах". Выходзіць Загад Міністэрства народнай асветы БССР № 301 ад 03.11.1957 г. "Аб узмацненні супрацьпажарнай бяспекі". Згодна з гэтым Загадам забаранялася:

праводзіць кінасеансы для дарослых у класах школы;

кінасеансы для выхаванцаў завяршаць не пазней 20.00.

У тым жа годзе адбылася XXI Рэспубліканская выстаўка творчасці "Общества глухонемых" па наступных намінацыях: "Разьба па косці", "Жывапіс", "Вышыўка", "Ткацтва", "Разьба па дрэве".

Прадстаўнікі школы прынялі актыўны ўдзел ў гэтай выстаўцы. Па выніках выстаўкі Навагрудская школа-інтэрнат для глуханямых дзяцей была ўзнагароджана грашовай прэміяй у памеры 75 руб. старшынёй Прэзідыума "Белорусского общества глухонемых при Министерстве среднего образования БССР М.Шостака".

Вынікова выступілі прадстаўнікі школы і на абласных спаборніцтвах па валейболе. Каманда заняла I месца і была ўзнагароджана вымпелам, а кожны член каманды Ганаровай граматай.

<u>Вось персанальны склад той "залатой" каманды:</u>

Мацеюк Павел Васільевіч;
Грыц Яўгенія Аляксандраўна;
Грамыка Аляксандр Міхайлавіч;
Бекрэнь Уладзімір Міхайлавіч;
Яфімчык Міхаіл Васільевіч;
Меркуль Леанід Пятровіч;
Прычынін Аляксандр Іванавіч;
Шпак Іван Пятровіч.

Аб тым, як жылі выхаванцы школы ў той час, можна мяркаваць па рэжыму дня школьнікаў:

- пад'ём – 7.00
- зарадка – 7.15-7.30
- ранішні туалет, уборка пакоя, запраўка ложкаў – 7.30-8.00
- сняданак – 8.00-8.30
- моўная зарадка – 8.30-8.45
- падрыхтоўка да заняткаў – 8.45-9.00
- вучэбныя заняткі – 9.00-13.00 (для 2 змены - падрыхтоўка ўрокаў)
- адпачынак на свежым паветры – 13.00-13.30
- абед – 13.30-14.30
- работа ў вучэбных майстэрнях – 14.30-17.00 (вучэбныя заняткі да другіх заняткаў)
- пазашкольная работа – 18.00-20.00
- вячэра і вячэрняя прагулка – 20.00-21.00
- адыход да сну – 21.00
- сон – 21.00-7.00

<u>У школе працавала 8 спартыўных секцый:</u>
валейбольная – 29 вучняў;
гарадочнага спорту – 19 вучняў;
лыжная – 48 вучняў;
лёгкай атлетыкі – 46 вучняў;
стральбы – 22 вучні;
шахматная – 28 вучняў;
шашачная – 18 вучняў;
настольнага тэнісу – 10 вучняў.

На працягу навучальнага года было выканана нарматываў II разраду па лыжных гонках – 13, па стральбе II разраду – 1. Узнагароджаны знакамі ГТО I разраду – 12 вучняў, II ступені – 8, атрымалі значкі БГТО – 12 вучняў. У абласной спартакіядзе ў складзе раённай каманды ўдзельнічалі 32 вучні школы, у рэспубліканскай спартакіядзе – 7.

Піянерская арганізацыя налічвала 40 піянераў, 16 акцябрат. Камсамольская арганізацыя налічвала 47 юнакоў і дзяўчат.

З падсобнай гаспадаркі (S=2га) было сабрана ў той год 13т он бульбы, 1200 кг ячменю. У школе мелася аўтамашына ГАЗ-51, ГАЗ-52, конь, увесь сельскагаспадарчы інвентар, было выгадавана 5 свіней.

У 1964-1965 навучальным годзе ў школе быў набыт кінаапарат вузкаплёначны "Кіеў". За год вучні змаглі паглядзець 21 мастацкі фільм. Сярод іх "Дорога в космос", "Подвиг", "Наша армия родная", "Великая Отечественная война", "Школьная бригада". У школе працавала 13 класаў-камплектаў з 1 па 12 класы.

| Клас | Кол-ць вучняў | Паспяховасць | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | "6-5" | "5-4" | "4-3" | "3-2" | "2-1" |
| 1 | 12 | 6 | 56 | 50 | 11 | 0 |
| 2 | 8 | | | | | |
| 3 | 8 | | | | | |
| 4 | 8 | | | | | |
| 5 | 12 | | | | | |
| 6 | 9 | | | | | |
| 7 | 8 | | | | | |
| 8 | 10 | | | | | |
| 9А | 11 | | | | | |
| 9Б | 10 | | | | | |
| 10 | 10 | | | | | |
| 11 | 8 | | | | | |
| 12 | 9 | | | | | |
| Усяго | 123 | | | | | |







Кожны год школа ў летні перыяд праводзіла рамонт па падрыхтоўцы да новага навучальнага года. Сумы, якіх выдзяляліся на гэтыя мерапрыемствы:

1949г. – 14631 руб.

1953г. – 10622 руб.

1954г. – 23502 руб. (капітальны рамонт)

1954г. – 14700руб. (цякучы рамонт)

1952г. – 30211 руб. (капітальны рамонт)

1965г. – 2500 руб.

1950г. – 185000 руб. (рэканструкцыя жылога дома пад сталовую)

1968г. – 3138 руб.

Кожны год школа выпускала ў самастойнае жыццё ад 7 да 12 выпускнікоў, даючы ім не толькі трывалыя веды, але і рабочую прафесію. На вялікі жаль, знайсці дакументы аб выдачы пасведчання аб адукацыі вучням Навагрудскай спецшколы-інтэрната, пакуль не ўдалося. У цякучым архіве Навагрудскай спецшколы-інтэрната і занальным архіве Гродзенскай вобласці ў г.Навагрудку іх няма. Магчыма, яны былі беззваротна страчаны, а магчыма, яны будуць знойдзены. Зараз ёсць дакладныя звесткі аб выпускніках толькі за: 1946 г. – 5 чал., 1947 г. – 7 чал., 1948 г. – 10 чал., 1955 г. – 10 чал., 1961 г. – 9 чал., 1962 г. – 10 чал., 1963 г. – 10 чал. (усяго 61).

Калі падлічыць, што за 7 гадоў колькасць выпускнікоў 61 чал., то за час існавання школы для глуханямых дзяцей з 1944 г. па 1966 г. яе скончылі прыкладна 191 чалавек.

18 снежня 1966 года пабачыў свет Загад Гродзенскага абласнога аддзела гарадской адукацыі № 222 “О реорга-низации Новогрудской школы-интерната для глухонемых детей и организации на её базе школы-интэрната для детей с тяжёлыми нарушениями речи”. Загадам прадпісвалася закрыць з 01.09.1966 года Навагрудскую школу-інтэрнат для глухіх дзяцей. Паводле гэтага загада на базе закрытай школы адчынялася школа для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы. Прадпісвалася выхаванцаў школы перавесці ў Ашмянскую шко -

лу-інтэрнат для глухіх дзяцей і іншыя школы Рэспублікі згодна з накіраваннямі Міністэрства асветы БССР. Такім чынам, закончылася гісторыя адной установы і пачынаецца гісторыя другой. Што цікава: загад аб звальненні работнікаў школы-інтэрната для глуханямых дзяцей і загад аб прыёме на работу ў школу-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы ў персанальным складзе не адрозніваюцца.

Для Навагрудскага раёна 1966-1967 навучальны год не вылучыўся глабальнымі падзе-ямі. У раёне працавала 117 школ. З іх пачатковыя школы налічвалі – 73, ВШ – 26, сярэд-нія – 18. Акрамя гэтага, працаваў адзін дашкольны дзіцячы дом, Навагрудская школа-інтэрнат, Адампальская школа-інтэрнат, 5 дзіцячых садкоў і Навагрудская школа-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы. У школах усіх тыпаў навучалася 14027 дзяцей, 943 дашкольнікі наведвалі діцячыя сады.

Для калектыву школы-інтэрната гэта быў складаны перыяд. Пераважная большасць вучняў была выведзена, з'явіліся новыя дзеці, якія не ведалі спецыфікі ўстановы, асаблі-васцей рэжыму дня.

Патрабавалі ўдумлівасці і адносіны з бацькамі. Школе патрэбна было занава заваёўваць аўтарытэт, сваё месца ў рэспубліканскай сістэме спецыяльных школ-інтэрнатаў.

Першы выпуск Навагрудская школа-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы ажыццявіла ў 1969 годзе – 12 выпускнікоў.

Пачатак 1970-х гадоў для вялікай краіны па імені СССР быў часам вялікіх надзей, стабільнасці, пераходам, даклад-ней, планаваннем масавага пераходу да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Адыйшоў на другі план "валюнтарызм" і "Кукурузная эпоха", пастулат, што быў агучаны на ХХ з'ездзе КПСС (школа-інтэрнат – гэта новы тып навучальнай установы, дзе дзеці будуць выхоўвацца на ідэях камунізму) заставаўся ў прыярытэце.

Напрыканцы 60-х гадоў пабудавана школа-інтэрнат у в.Адампаль, у 1960 годзе з'явіўся спальны корпус Навагрудскай школы-інтэрната на 190 месцаў, а ў 1973 годзе быў узведзены новы будынак Навагрудскай спецы-яльнай школы-інтэрната для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы па вул. Суворава, д. 9.

Прыгожы, прасторны, трохпа-вярховы будынак з харчба-локам, з вялікай тэрыто-рыяй, якую неабходна было аблага-роджваць, прыняў дзяцей. Нягледзячы на стабільнасць і нябеднае забяспячэнне, новая школа не адмовілася ад напрацовак, правераных часам.

У 1972 годзе даход ад падсобнай гаспадаркі складаў 4118 руб, а грошы былі зрасходаваны наступным чынам:

утрыманне падсобнай гаспадаркі (з/пл работнікаў) – 2934 руб.;

набыццё музычных інструментаў – 400 руб.;

набыццё халадзільнай устаноўкі – 400 руб.;

культурна-асветніцкія мерапрыемствы – 374 руб.

<u>У штаце школы 41 стаўка:</u>

дырэктар – 1
касцелянша – 1
намеснік дырэктара – 1
прачка – 2
урач – 1
кладаўшчык - 1
медыцынская сястра – 1
начная няня – 2
выхавальнікі – 12
рабочы кухні – 1
піянерважатая – 1
прыбіральшчыца – 4
старшы бухгалтэр – 1
конюх – 1
загадчык карэкцыйнай работы – 0,5
апальшчык (істопнік) – 3
шафёр – 1
вартаўнік – 1
загадчык гаспадаркі – 1
бібліятэкар – 0,5
повар – 1
памочнік повара – 1

Школа знаходзілася на балансе абласнога аддзела адукацыі. Самы вялікі аклад з усіх работнікаў быў у дырэктара школы – 160 руб. Самы малы: у повара, прачкі, дворніка, начной няні – 60 руб. Мовай навучання ў школе была руская.

Кантынгент вучняў спешко-лы-інтэрната складаўся заўсёды з двух частак: гарадскіх і сельскіх. Гэтае раздзяленне заўсёды ўліч-валася педагогамі. Так у 1976-1977 навучальным годзе ў школе навучалася 234 вучні, з іх хлопчыкі складалі 168 чалавек, а дзяўчынкі – 66. З гэтай катэгорыі 15 юнакоў і дзяўчат былі старэйшымі за 17 гадоў. Сярод вучняў 5-9 класаў гарадскіх дзяцей было 42, а сельскіх – 72.

У школе было арганізавана навучанне па кабінетнай сістэме. Працавалі вучэбныя кабінеты: біялогіі, фізікі і хіміі, лагапедычны, лінгафонны, чарчэння і малявання, кабінеты працы (абслугоўваючай і тэхнічнай), рускай мовы, гісторыі.

Школа на добрым узроўні была забяспечана тэхнічнымі сродкамі навучання.

<u>Да паслуг педагогаў былі:</u>

кінаапарат – 1
радыёвузел – 1
тэлевізар – 1
магнітафон – 5
электрапрыгатавальнікі – 10
кадаскоп – 1
эпідыяскоп –7
фільмаскоп – 15

1970-я гады сталі часам фарміравання калектыву (які заўсёды заставаўся стабільным, высокаадукаваным і згуртава-ным), часам распрацовак, знаходак і часам рэкламы сваіх магчымасцей.

Колькасны склад вучняў кожны навучальны год быў большым за 200 чалавек. Так у 1979-1982 навучальным годзе тут навучалася 215 вучняў у 17 класах-камплектах. Традыцыйна ў школе пераважалі хлопчыкі.

У гэтым навучальным годзе дзяўчынак налічвалася толькі 66. Школа выпускала 9 чалавек у самастойнае жыццё. З 215 вучняў школы былі 10 , старэйшых за 18 гадоў, з іх ўсяго дзве дзяўчынкі.

Вучэбная майстэрня ў школе была тэхнічна ўкамплектавана: такарных станкоў па дрэве было 4, па метале – 4, свідравальных – 3, фрэзерных – 2, фугавальных – 3.

Для паслуг дзяўчынак былі 12 швейных машын. Замежная мова, якая вывучалася ў школе – нямецкая. Цікава прасачыць, куды ўладкоў-валіся выпускнікі спецшколы-інтэрната, наколькі падрыхтаваны яны былі да самастойнага жыцця.

У 1980-1981 навучальным годзе школа дала пуцёўку ў жыццё 9 маладым людзям. <u>І вось куды яны пайшлі пасля школы:</u>

- Варанко Сяргей Іванавіч – СПТВ-56, г.Шчучын;
- Герус Васіль Аляксандравіч – рознарабочы, аўтапарк г.Дзятлава;
- Краўчук Людміла Іванаўна – даярка, к-с “Свіцязь”;
- Лаўрусік Сяргей Мікалаевіч – падсобны рабочы СМУ №15, г.Кобрын;
- Маляўка Аляксей Міхайлавіч – Лідскі індустрыяльны тэхнікум;
- Сарока Аляксей Паўлавіч – СПТВ №26 г.Навагрудак;
- Шабунька Мікалай Данілавіч – радыётэхнікум, г.Мінск;
- Сенько Алеся Аляксандраўна – СПТВ будаўнікоў, г.п. Карэлічы
- Шырко Уладзімір Віктаравіч –к-с “Свіцязь”.

Агульная колькасць вучняў на канец 1980-1981 навучальнага года складала 220 хлопчыкаў і дзяўчынак, аб’яднаных у 17 класаў-камплектаў.

Сярэдняя напаўняльнасць класаў складала 12,9 чалавек. Вучэбныя дасягненні школьнікаў, праўда, заставаліся далёка не ідэальнымі. Так па выніках



1981-1982 навучальнага года з 217 вучняў школы паспявалі на “5” – 1 вучань , на “5-4” – 49 вучняў, “4-3” – 166 вучняў, “3-2” – 1 вучань.

З кожным навучальным годам у школе павялічвалася колькасць прадметных кабінетаў. У 1982-1983 навучальным годзе 220 вучняў школы праходзілі навучанне ў 12 вучэбных кабінетах. Асаблівасцю школы было тое, што такі прадмет, як “Пачатковая ваенная падрыхтоўка”, не выкладаўся.

Педагагічны калектыў ставіў перад сабой амбіцыйныя задачы і шукаў шляхі да іх рэалізацыі. Перад калектывам школы ў 1983-1984 годзе, дарэчы, апошнім навучальным да “Перабудовачным годам”, стаялі наступныя задачы:

1. “Продолжить работу по выполнению решений 26 Съезда КПСС, 29 съезда КПБ по идейно-политическому и нравственному воспитанию учащихся.

2. Вести целенаправленную работу по повышению качества учебно-воспитательного процесса на основе реализации требований усовершенствованных программ, внедрения теории оптимизации, борьбы за преодоление формализма в оценке труда учителей и учащихся.

3. Обеспечить системную работу по исправлению речи учащихся, формирования речевой культуры, обращая особое внимание на изучение русского языка и развития речи.

4. Продолжить работу по научной организации педагогического труда, по развитию НОТ школьников.”

У гэтым годзе ў школе працавала 17 класаў, у якіх навучалася 206 дзетак.

| |
|---|
| 1 клас – 13 |
| 2 клас – 17 |
| 3 клас – 13 |
| 4 клас – 13 |
| 5 клас – 13 |
| 6А, 6Б класы – 26 |

| |
|---|
| 7А, 7Б класы – 25 |
| 8А, 8Б класы – 24 |
| 9А, 9Б, 9В класы – 33 |
| 10А, 10Б класы – 19 |
| 11А, 11Б класы – 10 |

Напаўняльнасць па класах выглядала наступным чынам:

Педагагічны працэс у школе забяспечвалі 8 дзясяткаў кваліфікацыйных педагогаў. У 1986-1987 навучальным годзе ў школе працавалі 83 педагагічныя работнікі.

Па стажы работы ў спецшколе падраздзяляліся па наступных катэгорыях:

| | 1 год | 1-4 гадоў | 5-9 гадоў | 10-14 гадоў | 15-19 гадоў | 20-24 гадоў | 25-29 гадоў | 30 і больш гадоў | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | - | 6 | 5 | 1 | - | 1 | - | 6 | 19 |
| Ж | - | 11 | 12 | 17 | 9 | 3 | 3 | 9 | 64 |
| | | | | | | | | | 83 |

Паводле ўзросце:

| | 18 г. | 19 г. | 20-24 г. | 25-29 г. | 30-34 г. | 35-39 г. | 40-44 г. | 45-49 г. | 50-54 г. | 55-59 г. | 60 і больш г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ж | - | - | 1 | 20 | 10 | 8 | 13 | 8 | 8 | 6 | 9 |

А навучэнцаў у тым навучальным годзе налічвалася 201, аб'яднаных у 15 класаў-камлектаў. У перабудовачныя гады, другая палова 1980-х гадоў, колькасць вучняў школы памяншаецца. Так у 1987-1988 навучальным годзе ў школе 185 вучняў у 14 класах-камплектах, у 1988-1989 навучальным годзе 187 вучняў у 15 класах-камплектах, у 1990-1991 навучальным годзе – 190 вучняў у 15 класах-камплектах.

Для гэтага перыяду характэрна паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння вучэбнага працэсу.

У 1987-1988 навучальным годзе ў наяўнасці 4 вузкаплёначныя кінаапараты, 4 каляровыя тэлевізары, 4 магнітафоны. У прафсаюзнай арганізацыі работнікаў асветы знаходзілася 79 педагагічных работнікаў.

Гэта быў год, калі ў архіўных матэрыялах упершыню не прасочваецца падсобная гаспадарка.

Матэрыяльная база школы гэтага перыяду – гэта сталовая на 135 пасадачных месцаў, спартыўная зала S=80м$^2$. У бібліятэцы ў той час налічвалася – 15975 экз. кніг, з іх – 5459 падручнікі. Прышкольны вучэбна-вопытны ўчастак павялічыўся да 1 га плошчы.

З 16 выпускнікоў школы пайшлі ў самастойнае жыццё, паступілі: СПТВ – 2 чалавекі, СУЗУ і ВНУ – 9, уладкаваліся на працу – 11.

Распад Савецкага Саюза ў снежні 1991 года ўнёс свае карэктывы ва ўсёй сферы жыцця грамадства вялікай краіны. Пачынаючы з 1991-1992 навучальнага года, школа пераходзіць пад юрысдыкцыю гарадского аддзела адукацыі.

Напэўна, за сухімі лічбамі і пералічанымі дасягненнямі ў паважанага чытача складаецца ўражанне, што ў школе не было праблемных і надзвычайных падзей. Гэта далёка не так.

На працягу існавання з 1944 г. па 2020 г. у школе адбыліся пажары featureрознай лакалізацыі з прычыненнем матэрыяльнай шкоды, але без чалавечых ахвяр:

1950 г. пажар у паветцы для захоўвання дроў (05.02.) па прычыне неасцярожнага курэння;

1959 г. непатушаная керасінавая лямпа (10.11.) прывяла да пажару ў рабочым памяшканні;

1968 г. пажар у бібліятэцы. Прычына – перакал печкі.

1976 г. (16.03.) па нядбайнасці абслугоўваючага персаналу адбыўся выбух двух катлоў у кацельні;

1987 г. (19.03.) пажар у гардэробе (прычына не высветлена).

І гэта далёка не поўны пералік. Але адміністрацыя і яе калектыў заўсёды аператыўна вырашалі ўзнікшыя праблемы.

На мяжы новага тысячагоддзя пачынаецца новы этап ў развіцці спецшколы. Па-першае, з'яўляецца праграма і канцэпцыя спецыяльнага навучання. Характэрныя для савецкай школы першае і другое аддзяленні, з адпаведным тэрмінам навучання ў 9 і 11 гадоў адыходзіць. Час навучання становіцца 10 гадоў (час навучання у агульнаадукацыйнай базавай школе ў гэты час складаў 9 гадоў).

Станаўленне нацыянальнай сістэмы адукацыі пасля 1991 года ў Беларусі напрамую закранула і сістэму спецыяльнай адукацыі. Па-першае: у 1990-х гадах у кожным раёне Беларусі ствараюцца Цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання, якія становяцца асноўнай установай для навучання і выхавання для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Па-другое, ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі адкрываюцца класы і групы поўнай ці частковай інтэграцыі, у якіх ажыццяўляецца сумеснае навучанне дзяцей з АПФР і дзяцей на агульнаадукацыйных праграмах. Па-трэцяе, у грамадстве змяняюцца адносіны да такога тыпу навучальных устаноў, як школы-інтэрнаты. Па-чацвёртае, робіцца крэн на сямейныя формы ўладкавання дзяцей сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў. Па-пятае, набірае папулярнасць інклюзіўная форма навучання.

Пералічваючы гэтыя тэндэнцыі, мы не павінны ўпусціць і яшчэ адну важную асаблівасць у развіцці адукацыі ў РБ гэтага перыяду – працэс аптымізацыі ўстаноў адукацыі.

У такіх умовах толькі па Навагрудскім раёне былі зачынены: Адампальская спецшкола-інтэрнат, Навагрудская школа-інтэрнат для дзяцей з адхіленнямі ў паводзінах і ў сем'ях з неспрыяльнымі ўмовамі для жыцця. А ў цэлым, па вобласці за перыяд 1991-2019 гг. былі зачынены больш дзясятка школ-інтэрнатаў і дзіцячых дамоў. У такіх умовах перад кіраўніцтвам Навагрудскай спецшколы-інтэрната стаяла некалькі надзвычай складаных задач:

1. захаваць калектыў педагогаў, традыцыі і метадычныя распрацоўкі, якія ажыццяўляліся напрацягу дзесяцігоддзяў;

2. праводзіць мэтанакіраваную работу па камплектаванні школы-інтэрната кантынгентам навучэнцаў;

3. пераканаць кіраўніцтва раённых і абласных структур у неабходнасці і эфектыўнасці работы спецшколы-інтэрната, запатрабаванасці прадастаўляемых адукацыйных паслуг.

Нягледзячы на надзвычай складаныя фінансавыя стасункі, нізкую зарабатную плату, удалося захаваць калектыў і школу-інтэрнат, як унікальную ўстанову ў РБ.

Рэспубліка ў 1990-2000 гады актыўна змагалася з наступствамі Чарнобыльскай трагедыі. Шматлікія дабрачынныя неурадавыя арганізацыі працягнулі руку дапамогі краіне, у цэлым, і яе інстытутам, у прыватнасці.

Пачынаючы з сярэдзіны 90-х гадоў Навагрудская спецшкола-інтэрнат наладзіла цесныя сувязі з такімі арганізацыямі Італіі і Іспаніі. На першым этапе яны запрашалі выхаванцаў школы адзін-два разы на год за мяжу на аздараўленне. Пазней з'явілася паразуменне таго, што беларускія дзеці павінны мець не толькі за мяжой спрыяльныя ўмовы для пражывання і навучання, але і ў Беларусі на месцы сталага пражывання і навучання.

У спецшколе ажыццяўлялася некалькі доўгатэрміновых праектаў праз шматканальнае фінансаванне. У першую чаргу, гэта рэканструкцыя спальных памяшканняў, памяшканняў, дзе жывуць навучэнцы школы.

Змест вялікіх на 5-8 чалавек пакояў, з'яўляюцца ўтульныя пакоі на 2-3 чалавекі. Была заменена мэбля пакояў, калідоры і рэкрыяцыі школы, дзякуючы неабыякавасці калектыву школы набываюць выгляд утульных месцаў для вучобы і адпачынку. Па-другое, была ажыццёўлена паэтапная рэканструкцыя харчаблока з заменай тэхнічнага абсталявання.

Трэба аддаць належнае замежным партнёрам, якія закупілі і паставілі тэхналагічнае абсталяванне. Па-трэцяе, была рэканструявана прачачная, дзе было ўстаноўлена сучаснае еўрапейскае абсталяванне. Па-чацвёртае, у школе сіламі калектыву гаспадарчай группы УА беларускіх спонсараў была праведзена рэканструкцыя знешней каналізацыі і ўнутраных санітарных вузлоў. І па-пятае, у гэты перыяд у школу паступіў спецыялізаваны аўтатранспарт, які дазволіў больш аператыўна вырашыць праблемы падвозу выхаванцаў школы-інтэрната ў медыцынскія і іншыя ўстановы.

Колькасць навучэнцаў спецшколы-інтэрната на працягу 1990-2020 гадоў перацярпела пэўныя ўздымы і падзенні, мяркуйце самі:

У 1991-1992 навучальным годзе ў школе навучалася 180 дзяцей, з іх 112 хлопчыкаў і 68 дзяўчынак. Сярэдняя напаўняльнасць класаў складала 12,8 чалавек. У гэтым навучальным годзе працавалі ў школе 26 настаўнікаў і 29 выхавальнікаў.

У 1999-2000 навучальным годзе ў школе 14 класаў-камплектаў, у якіх навучалася 155 вучняў.

У 2000-2001 навучальным годзе – 15 класаў-камплектаў і 158 вучняў.

У 2002-2003 навучальным годзе кіраўніцтвам школы робіцца каардынальны крок – адкрываецца дашкольная лагапедычная група. У той год напаўняльнасць групы складала толькі 6 чалавек. Група працавала больш за 10 гадоў і паказала сваю эфектыўнасць, але з-за недасканаласці заканадаўчай базы была закрыта.

У 2002-2003 навучальным годзе ў школе 12 класаў-камплектаў з колькасцю вучняў 113.

У 2005-2006 навучальным годзе працуе 13 класаў-камплектаў, дзе навучаецца 121 вучань.

У 2018-2019 навучальным годзе – 18 класаў-камплектаў і 126 вучняў.

На працягу 2010-2020 гадоў школа-інтэрнат заявіла аб сабе як апорнай у спецадукацыі як у Гродзенскай вобласці, так і ў краіне ў цэлым. Актыўны ўдзел у праектнай дзейнасці, прафесійным жыцці, па водкугах на вострыя, актуальныя праблемы часу сталі падмуркам таго, што, пачынаючы з 2016 года, школа-інтэрнат з'яўляецца Абласным рэсурсным цэнтрам. Неаднаразова настаўнікі-лагапеды ўстановы з'яўляліся рэцэнзентамі падручнікаў і метадычных распрацовак па спецадукацыі.

# Глава 2. Галоўнае багацце – людзі

На працягу 75 гадоў у школе-інтэрнаце працавала больш як 800 работнікаў – як педагогаў, так і абслугоўваючага персаналу. Нягледзячы на ўнушальнасць, на першы погляд, лічба не такая вялікая. Гэта гаворыць аб стабільнасці калектыву школы ў розныя перыяды. Безумоўна, заслуга ў згуртаванасці калектыву, яго накіраванасці на выкананне пастаўленых задач кіраўнікоў установы. За гэты перыяд на капітанскім мосціку знаходзілася 12 чалавек. Вось гэтыя людзі:

1. Шулевіч Генадзій Барысавіч 1(5.12.1944 – 12.06.1945 гг.);
2. Сурыновіч Аляксандр Віктаравіч 13.06.1945 – 08.01.1946 гг.;
3. Кацалапаў Васіль Анатольевіч (09.01.1946 – 25.12.1955 гг.);
4. Няхай Раман Іосіфавіч (27.08.1955 – 15.12.1968 гг.);
5. Барабашова Валянціна Іванаўна (16.12.1968 – 03.08.1973 гг.);
6. Пашынскі Леанід Фёдаравіч (04.08.1973 – 01.12.1983 гг.);
7. Дзедавец Уладзімір Ціханавіч (вык.абавязкі) (01.12.1983 – 30.07.1984 гг.);
8. Іваноў Уладзімір Віктаравіч (01.07.1984 – 17.06.1999 гг.);
9. Русецкая Валянціна Іванаўна (01.09.1999 – 15.08.2002 гг.);
10. Ермакова Алена Яўгеньеўна (13.02.2002 – 10.08.2010 гг.);
11. Жыдко Мая Ахмедаўна (25.08.2010 – сакавік 2019 гг.);
12. Анікевіч Алег Аркадзьевіч (01.04.2019 г.).

Большасць капітанаў складалі мужчыны. Самы працяглы час кіраваў школай Іваноў Уладзімір Віктаравіч – 15 гадоў і Няхай Раман Іосіфавіч – 13 гадоў. Менш за ўсё Шулевіч Генадзій Барысавіч – 7 месяцаў і Сурыновіч Аляксандр Віктаравіч – 7 месяцаў. Кожны з кіраўнікоў у пэўнай ступені адказваў і забяспечваў прыярытэтны накірунак у развіцці школы.

Так для Кацалапава Васіля Анатольевіча і Няхай Рамана Іосіфавіча – гэта было станаўленне школы як самастойнай адзінкі, падбор і расстаноўка кадраў. Для Барабашовай Валянціны Іванаўны, Пашынскага Леаніда Фёдаравіча – гэта перакваліфікацыя школы, забеспячэнне метадычнага суправаджэння і шырокіх рэкламных магчымасцей педкалектыву па карэкцыі маўлення, завая-ванне аўтарытэту ў асяродку прафесіяналаў. Для Іванова Уладзіміра Віктаравіча – утрыманне заваяваных пазіцый і выхад на якасна новы ўзровень у матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні. Для Ермаковай Алены Яўгеньеўны – выхад на ранняе выўленне дзяцей з ЦПР і аказанне комплекснай дапамогі, маштабнай рэканструкцыі памяшканняў, забеспячэнне камфортных ўмоў для навучання і выхавання. Для Жыдко Майі Ахмедаўны – станаўленне школы як апорнай у рабоце з ЦПР, стварэнне абласнога рэсурснага цэнтра.

Доўгі час у школе працавалі ветэраны ВАВ: Пашынскі Леанід Фёдаравіч, Дзедавец Уладзімір Ціханавіч, Сакалова Алена Анатольеўна, Несцярэнка Уладзімір Аляксандравіч.

Дзесяць гадоў жыцця прысвяціў школе выдатнік народнай асветы БССР, заслужаны настаўнік БССР – Пашынскі Леанід Фёдаравіч. Больш за трыдцаць гадоў працавалі у школе:

Гапонцава Любоў Грыгор'еўна
Манукова Тамара Аркадзьеўна
Кажаева Таццяна Васільеўна
Лычыц Таццяна Міхайлаўна
Зайко Наталля Усеваладаўна
Шчэмер Таццяна Пятроўна
Дукшт Людміла Уладзіміраўна
Сянько Алена Аляксандраўна
Няпраўская Людміла Антонаўна
Даражэй Міхаіл Міхайлавіч
Сачко Уладзімір Сямёнавіч

Шмат увагі выхаванню падрастаючага пакалення ўдзяляюць:

Сініца Леанід Паўлавіч
Краўцова Таццяна Барысаўна
Дукшт Людміла Уладзіміраўна
Петушкова Іна Вячаславаўна
Сачко Уладзімір Сямёнавіч
Гасціла Наталля Мікалаеўна
Тарас Алена Войцехаўна
Даражэй Міхаіл Міхайлавіч

Складана ўявіць школу без ветэранаў медыкаў:

Лук'янчук Міхаіл Пятровіч
Ківач Марыя Пятроўна
Феданяк Таццяна Іванаўна

Работнікаў кухні:

Шышкір Жанна Уладзіміраўна
Семашка Валянціна Анатольеўна

Нязменнай касцяляншы – Пісарук Галіна Станіславаўны.

Для кожнага з гэтых людзей слова "дзеці" з'яўляецца сінонімам любові, дабрыні і радасці.

# Глава 3. Школа на сучасным этапе







Школа жыве кожную гадзіну, калідоры запаўняюцца дзіцячым смехам, кожны дзень адміністрацыя школы ажыццяўляе кіруючую дзейнасць, педагогі ідуць на ўрокі і выхаваўчыя мерапрыемствы. Кожны дзень нехта з вучняў здзяйсняе “геранчныя” ўчынкі і кожны дзень ідзе разгляд гэтых дзеянняў пад пільнай увагай выхавальнікаў у адпаведнасці з правіламі і паводзінамі вучняў школы.

Па стане на 01.01.2020 года ў школе навучалася 115 вучняў у 18 класах-камплектах.

Згуртаваная работа 66 педагагічных работнікаў, 7 медыцынскіх работнікаў забяспечваюць кругласутачнае педагагічнае і медыцынскае суправаджэнне дзяцей.

Матэрыяльная база школы дазваляе ісці ўровень з тэхнічным прагрэсам. У наяўнасці ў школе: 27 адзінак камп’ютарнай тэхнікі, 3 мультымедыйныя ўстаноўкі, 12 тэлевізараў. У школе працуе сайт установы адукацыі.

За апошні год у сродках масавай інфармацыі краіны з’явілася 12 артыкулаў з трансляцыяй передавога вопыту работы школы.

Школа забяспечана аўтатранспартам. Выкарыстоўваецца машына WW Каравала-1994 года выпуску, якую падарылі італьянскія партнёры.

Кожны дзень вучэбны, тэхнічны і абслугоўваючы персанал працуе над паляпшэннем матэрыяльна-тэхнічнай базы школы.

Так, у межах навагодняй дабрачыннай акцыі “Нашы дзеці” школа здолела прыцягнуць спонсарскай дапамогі на 13 тыс. бел. руб., што дазволіла замяніць 9 акон на сучасныя шклопакеты, замяніць трое дзвярэй, набыць спартыўны інвентар, тэлевізар, камп’ютарную тэхніку.

Куды рухацца, што рабіць, як забяспечыць бесперабойную работу школы? На якія рубяжы мы павінны выйсці?

Сённяшні педагагічны калектыў, адміністрацыя школы бачаць сваёй галоўнай задачай забеспячэнне вучняў неабходнай карэкцыйнай і педагагічнай дапамогай, стварэнне бяспечных умоў для іх жыцця і адпачынку. Забеспячэнне вучням з іншых рэгіёнаў камфортных умоў пражывання. Паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы школы, каб забяспечыць усе вучэбныя кабінеты камп’ютарнай тэхнікай для работы на ўроку як настаўніка, так і вучня.

Кожны год школа папаўняецца не толькі новымі дзецьмі, але і маладымі педагогамі. Мы ўпэўнены, што, зрабіўшы адзін раз выбар на карысць Навагрудскай спецшколы-інтэрната, маладыя педагогі будуць вернныя ёй усё жыццё. Мы ўпэўнены, што нашы выпускнікі, атрымаўшы любоў і веды, сфарміраваўшы свой жыццёвы вопыт, будуць канкурэнтназдольнымі і запатрабаванымі на рынку працы і паспяховымі людзьмі па жыцці.

75 гадоў – гэта працягласць жыцця аднаго пакалення, жыцця, напоўненага яркімі, незабыўнымі старонкамі, асвечанага дзіцячымі ўсмешкамі. Мы верым, што так было, ёсць і будзе…







# Факты і лічбы

За перыяд існавання школы-інтэрната ў яе сценах навучаліся дзеці з 98 рэгіёнаў СССР. З 91 рэгіёна БССР і з 7 рэгіёнаў за межамі БССР (Літоўская ССР і РСФСР).

Рашэнне Баранавіцкага Абласнога Савета дэпутатаў ад 14.12.1944г. № 205 "Об организации и открытии школы слуха и речи в Барановичской области".

05.12.1945г. пачала працаваць "Навагрудская Рэспубліканская школа глуханямых".

1946г. у школе мелася ветраэнергетычная ўстаноўка ВД-3,5 магутнасцю 1000Ват.

За перыяд існавання школа-інтэрнат некалькі разоў мяняла сваю назву:

15.08.1944г. - па 31.08.1966г. – школа-інтэрнат для глуханямых дзяцей.

З 01.09.1966г. – 07.07.2017г. - Навагрудская школа-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы.

07.07.2018г. – па цяперашні час - Навагрудская школа-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы, парушэннямі псіхічнага развіцця, цяжкасцямі ў навучанні.

За перыяд свайго існавання школа размяшчалася:

1. г. Навагрудак, вул. Свярдлова, д.15А – 15.08.1944-20.11.1945гг.
2. вуліца Камсамольская, д.9 – 20.11.1945 – 1947гг.
3. вуліца Леніна, д.59 – 15.08.1947-1973гг.
4. вуліца Суворава, д.9 – 01.09.1973 – па цяперашні час.

Больш за ўсё дзяцей навучалася ў спецшколе -інтэрнаце г.Навагрудка ў перыяд з 1944г. па 2019г. з наступных рэгіёнаў:

1. Навагрудскі р-н – 469
2. Карэліцкі р-н – 238
3. Лідскі р-н – 228
4. г.Мінск і Мінскі р-н – 156
5. Дзятлаўскі р-н – 193
6. г.Гродно і Гродзенскі р-н – 139
7. Шчучынскі р-н – 106
8. Слонімскі р-н – 70
9. Іўеўскі р-н – 72
10. Воранаўскі р-н – 70

Менш за ўсё вучняў, па два, было з наступных раёнаў: Бярэзінскага, Клічаўскага, Краснасельскага, Касцюковіцкага, Пастаўскага, Мядзельскага, Бешанковіцкага, Аршанскага.

Самыя вялікія выпускі былі:
1978г. – 30 чалавек
1997г. – 36 чалавек
1998г. – 23 чалавекі

Самыя малыя выпускі былі:
1994г. – 8 чалавек
2002г. – 8 чалавек
2007г. – 7 чалавек

06.04.1950г. – у школе з'явіўся першы аўтамабіль. Першым вадзіцелем быў Шустаў Андрэй Іванавіч.

05.02.1950г. – адбыўся пажар ў навесе, дзе захоўваліся школьныя дровы (прычына неасцярожнае курэнне)

1950г. – адбылася рэканструкцыя драўлянага жылога дома пад сталовую. У гэтым мерапрыемстве актыўны ўдзед бралі вучні школы

Буйныя рамонтныя работы ў школе праводзіліся:
1949г. – на суму 14631руб.
1952г. – на суму 30211руб.
1953г. – на суму 10622руб.
1954г. – на суму 23502руб. (капітальны рамонт корпуса №2 і цякучы рамонт школы на суму 14700руб.)
1965г. – на суму 2500руб.
1968г. – на суму 3138руб.

10.11. 1959г. – адбыўся пажар, непатушаная керасінавая лямпа прывяла да пажару ў рабочым памяшканні

01.09.1966г. – была зачынена Навагрудская школа-інтэрнат для глуханямых дзяцей (Загад абласнога аддзела Народнай адукацыі №116 ад 31.08.1966)

01.09.1966г. – была адкрыта Навагрудская спецшкола-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы

1968г. – адбыўся пажар у бібліятэцы. Прычына - перакал печкі.

1960-1961 навучальным годзе ў Навагрудскай спецшколе-інтэрнаце было два аўтамабілі ГАЗ-51 і ГАЗ-52

1961г. – у Гродзенскай вобласці тры школы-інтэрнаты для глуханямых дзяцей: Ашмянская, Ваўкавыская, Навагрудская

1958г. – у школе-інтэрнаце для глуханямых дзяцей з'явіўся тэлефон з нумарам 1-36

1959г. – агульная плошча ўсіх будынкаў школы-інтэрната для глуханямых дзяцей па адрасах: вул.Леніна, 75 і вул.Леніна, 59 складала S 1350м2. Мелася 40 печак і 2 пліты. У школе навучалася 115 дзяцей, працавала 8 рознаўзроневых груп

1962-1963гг. навучальны год у школе 12 класаў-камплектаў, у якіх навучалася 90 вучняў

1964-1965гг. – у школе 13 класаў-камплектаў і 123 вучні

1972г. – падсобная гаспадарка школы дала прыбытак 4118руб. У штаце школы 41 стаўка работнікаў

1976-1977гг. – у школе 234 вучні, з іх хлопчыкаў 168, дзяўчынак 66. Юнакоў і дзяўчат старэйшых за 17 гадоў – 15.





16.03.1976г. – па нядбайнасці дзяжурных качагараў былі ўзарваны воданагравальныя катлы ў школьнай кацельні

1978г. – у школе працуе 49 педагагічных работнікаў і 27 чалавек абслугоўваючага і тэхнічнага персаналу

1979-1980гг. – у школе 17 класаў-камплектаў, 215 вучняў, з іх 66 дзяўчынак. У школе арганізавана работа 9 прадметных кабінетаў

1980-1981 навучальны год – 220 вучняў, 17 класаў-камлектаў

1981-1982 навучальны год – 217 вучняў 17 класаў-камлектаў

1982-1983 навучальны год – 220вучняў 17 класаў-камлектаў, з іх 76 дзяўчынак

1983-1984 навучальны год – 206 вучняў 17 класаў-камлектаў

1986-1987 навучальны год – 201 вучань 15 класаў-камлектаў

1987-1988 навучальны год – 185 вучняў 14 класаў-камлектаў

1988-1989 навучальны год – 187 вучняў 15 класаў-камлектаў

1987г. – у школе працуе 75 работнікаў, з іх 50 педагогаў

16.11.1987г. – адбылася перадача школьнай кацельнай на баланс ЖКГ19.03.1987г. – у школе адбыўся пажар (прычына невядома)

Май 1988г. – у школе працуе 78 работнікаў, з іх 52 педагагічныя работнікі

1988-1989гг. – у школе 187 дзяцей, 15 класаў-камплектаў, 78 дзяўчынак. Школьны фонд бібліятэкі налічвае 17719 экз., з іх 5853 экз. падручнікаў.

1990-1991 навучальны год – у школе 190 вучняў, з іх 66 дзяўчынак і 15 класаў-камплектаў. S усіх памяшканняў школы – 3849 м2

1991-1992гг. – 180 вучняў, 15 класаў-камплектаў, дзяўчынак – 68. Працавала 26 настаўнікаў, 29 выхавальнікаў

2000г. – у школе 58 педагагічных работнікаў і 26 работнікаў тэхнічнага персаналу

1999-2000 навучальны год – у школе 153 вучні

2000-2001 навучальны год – у школе 150 вучняў

2002-2003 навучальны год – пачала працаваць лагапедычная група, у школе 12 класаў-камплектаў, агульная колькасць вучняў – 113

2005-2006 навучальны год – 13 класаў-камплектаў, з іх 121 вучань

2009 год – школа стала юрыдычнай асобай

2018-2019 навучальны год – у школе 18 класаў-камплектаў, з іх 126 вучняў

2019-2020 навучальны год – у школе 115 вучняў, 18 класаў-камплектаў. У школе працуе 66 педагагічных работнікаў





Дадатак №2

# Спіс дырэктараў школы-інтэрната

**Шулевіч Генадзій Барысавіч 15.12.1944 – 12.06.1945гг.**
**Сурыновіч Аляксандр Віктаравіч 13.06.1945 – 08.01.1946гг**
**Кацалапаў Васіль Анатольевіч 09.01.1946 – 25.12.1955гг.**
**Няхай Раман Іосіфавіч – 27.08.1955 – 15.12.1968гг.**
**Барабашова Валянціна Іванаўна – 16.12.1968 – 03.08.1973гг.**
**Пашынскі Леанід Фёдаравіч – 04.08.1973 – 01.12.1983гг.**
**Дзедавец Уладзімір Ціханавіч (вык. абавязкі) – 01.12.1983 – 30.07.1984гг.**
**Уладзімір Віктаравіч – 01.07.1984 – 17.06.1999гг.**
**Русецкая Валянціна Іванаўна – 01.09.1999 – 15.08.2002гг.**
**Ермакова Алена Яўгеньеўна – 13.02.2002 – 10.08.2010гг.**
**Жыдко Мая Ахмедаўна – 25.08.2010 – сакавік 2019 гг.**
**Анікевіч Алег Аркадзьевіч – 01.04.2019гг.**